## Абзац

■ Споўнілася 80 гадоў з дня нараджэння вядомай беларускай паэткі Еўдакіі Лось. Памерла ў 1977 годзе.

**■ 11 рыбакоў і 2 паляўнічых «злавілі» беларускія памежнікі за мінулыя выхадныя. У Брагінскім раёне затрыманы 11 рыбакоў за тое, што яны лавілі рыбу ў памежнай паласе. А гродзенскія памежнікі затрымалі двух паляўнічых, якія мала што палявалі ў памежнай паласе, але да ўсяго не мелі рэгістрацыі на стрэльбы і ліцэнзій. Парушальнікі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці, паведамляе БЕЛТА.**

■ Трое грузін, выпіўшы для смеласці, у маскхалатах спрабавалі парушыць мяжу Беларусі, але іх спынілі гродзенскія памежнікі. Затрыманыя расказалі, што спрабавалі трапіць у Еўрасаюз з мэтай далейшага працаўладкавання.

## Поўны абзац

**■ Студэнт кітайскага ўніверсітэта СМІ і камунікацый пазбегнуў адлічэння з навучальнай установы, прадаўшы 5 тон мандарынаў. Малады чалавек паходзіць з беднай вясковай сям'і, і яму не было чым заплаціць за наступны семестр навучання. Між тым ураджай цытрусавых у яго роднай вёсцы сёлета быў вельмі добрым, але мандарыны засталіся непрададзенымі з-за эканамічнага крызісу. Бацька аддаў трэць ураджаю сыну, каб той паспрабаваў расплаціцца за вучобу. Юнак прывёз мандарыны ва ўніверсітэт. І за гадзіну яны былі прададзеныя: СМІ шырока асвятлілі гэтую гісторыю, і кампаніі і сем'і скуплялі цытрусавыя скрынямі.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже производственной базы (гараж площадью 266 кв.м, склад – 309 кв.м, служебное помещение – 35 кв.м, ж/б ограждение протяженностью 234 п. м), расположенной в п. Сосновый Осиповичского района. Площадь земельного участка 0,3537 га. Начальная цена – 30 094 511 бел. рублей с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.05.2008 г. Аукцион состоится **10.03.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.03.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 324.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Знаёмім з нашымі чытачамі, якія ў Зэльве атрымалі вялікі ці маленькі падарунак ад «Звязды». Тэлевізар «Віцязь» упрыгожыць хатні інтэр'ер Людмілы Аляксандраўны ІГОЛКІ. Кубачкі з лагатыпам «Звязды» засталіся ў літрэдактара Людмілы ДАНЕЦ і лабаранта Ліліі КАРПОВІЧ. Насценны гадзіннік для агульнага карыстання прыняў кіраўнік справамі райвыканкама Сяргей Паўлавіч ГОРНЫ. Электрачайнік для паштальёна Зоі КНІГІ перадаў начальнік вузла паштовай сувязі Генадзь ЧЫЖЭЎСКІ.**

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

*Мінск—Ліда—Шчучын—Масты—Ваўкавыск—Зэльва—Слонім—Мінск.*

### Табе, абітурыент

# РЭГІСТРУЕМСЯ НА ПРАФАДБОР

Як паведамляла «Звязда», 5 сакавіка ў Беларусі распачнецца рэгістрацыя для праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі абітурыентаў ВНУ, якія плануюць паступаць на 10 спецыяльнасцяў, дзе да будучых спецыялістаў дзяржавай прад'яўляюцца асаблівыя патрабаванні. Нагадаем, што ў іх пералік уваходзяць спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны» «міжнароднае права», «правазнаўства», «эканамічнае права», «журналістыка», «міжнародная журналістыка» і «мытная справа».

У Міністэрстве адукацыі просяць звярнуць увагу будучых абітурыентаў на наступную акалічнасць: гутарка праводзіцца пры паступленні на ўсе формы атрымання адукацыі (дзённую, вячэрнюю, завочную, у тым ліку дыстанцыйную), для навучання ў скарочаныя тэрміны, на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, для атрымання другой і наступнай вышэйшай адукацыі як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і на ўмовах аплаты фізічнымі і юрыдычнымі асобамі. Аднак гэта палажэнне не распаўсюджваецца на асобаў, якія пажадалі ўзяць удзел у конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі ў ВНУ, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў для Узброеных Сілаў, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў, органаў унутраных спраў, а таксама для органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях. **Не трэба будзе праходзіць прафесійна-псіхалагічную гутарку і замежным грамадзянам, якія плануюць паступаць у беларускія ВНУ. Праходжанне прафесійна-псіхалагічнай гутаркі абавязковае для грамадзян Рэспублікі Беларусь, іншаземных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.**

Рэгістрацыя для ўдзелу ў гутарцы будзе весціся з 5 па 31 сакавіка на падставе іх асабістых заяў . Заява можа быць пададзена грамадзянінам асабіста ці быць накіравана па пошце. У першым выпадку будучы абітурыент асабіста паказвае пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць яго асобу. А пры накіраванні па пошце да заявы прыкладаецца копія пашпарта ці іншага дакумента, які сведчыць асобу. Адказнасць за правільнасць і праўдзівасць звестак заявы ўскладаецца на грамадзяніна. Заявы, якія паступяць пасля 31 сакавіка, разглядацца не будуць.

Грамадзяніну, які падаў заяву для ўдзелу ў гутарцы, паведамяць месца і час правядзення гутаркі асабіста ці па пошце. Гутарка пройдзе з 5 па 30 красавіка, у адпаведнасці з графікамі, зацверджанымі ВНУ. Кандыдат, які па ўважлівай прычыне не зможа прайсці гутарку ў прызначаны тэрмін, згодна з рашэннем камісіі можа быць допушчаны да ўдзелу ў гутарцы ў межах тэрмінаў, вызначаных графікам правядзення гутаркі. Праўда, уважлівая прычына павінна быць пацверджана дакументальна.

Па выніках гутаркі камісіяй прымаецца рашэнне рэкамендаваць або не рэкамендаваць кандыдата для ўдзелу ў конкурсе па абранай спецыяльнасці (групе спецыяльнасцяў). Рашэнне прымаецца простай большасцю галасоў членаў камісіі. **Дакументам аб выніках праходжання гутаркі з'яўляецца рэкамендацыя для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі.** Рэкамендацыя выдаецца кандыдату ў дзень праходжання гутаркі і дзейнічае да канца бягучага каляндарнага года.

Нагадаем, што рэгістрацыя для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні распачынаецца ў маі, пасля завяршэння правядзення ў ВНУ прафесійна-псіхалагічнай гутаркі. Такім чынам у абітурыентаў, якім па нейкай прычыне не пашанцуе на папярэднім прафадборы, будзе магчымасць і час, каб пераарыентавацца ў выбары прафесіі, і, адпаведна, у выбары дысцыплін для здачы на цэнтралізаваным тэсціраванні...

І напрыканцы яшчэ адна істотная заўвага — для таго, каб прайсці прафесійна-псіхалагічную гутарку, скажам, жыхару Гродна, які плануе паступаць на спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне» ці «журналістыка» ў сталічныя ВНУ, яму зусім неабавязкова ехаць для гэтага ў сталіцу. Ён зможа прайсці прафадбор у сваім абласным цэнтры (глядзі прыведзены пералік ВНУ). Аналагічны прынцып рэалізуецца пры здачы цэнтралізаванага тэсціравання. **Для атрымання рэкамендацыі не мае ніякага значэння, дзе абітурыент праходзіў гутарку, як не мае значэння, дзе абітурыент здаваў цэнтралізаваныя тэст-экзамены.** Так, будучыя журналісты могуць прайсці прафадбор не толькі ў БДУ, але і ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка, дзе рыхтуюць журналістаў для дзіцячых і юнацкіх СМІ, а таксама ў Магілёўскім, Гродзенскім дзяржаўных універсітэтах і Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва ў Мінску. Да таго ж трэба мець на ўвазе, што праходзіць гутарку пры паступленні на спецыяльнасць «правазнаўства» давядзецца ўсім абітурыентам прыватных ВНУ. Не дапускаецца рэгістрацыя на адну і тую ж спецыяльнасць (групу) спецыяльнасцяў у розных ВНУ. У тым выпадку, калі грамадзянін зарэгіструецца больш чым адзін раз, ён будзе дапушчаны да ўдзелу ў гутарцы па даце самай ранняй першапачатковай рэгістрацыі. У Міністэрстве адукацыі сцвярджаюць, што вылічыць хітруноў для іх не праблема. Адпаведны механізм ёсць у Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, які даўно і паспяхова вылічвае «двайнікоў» пры рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Пералік месцаў правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі

| *Спецыяльнасць (група спецыяльнасцяў)* | *Вышэйшыя навучальныя ўстановы — месцы правядзення прафесійна-псіхалагічнай гутаркі* |
|---|---|
| Дзяржаўнае кіраванне,<br>Дзяржаўнае кіраванне і права.<br>Дзяржаўнае кіраванне<br>і эканоміка: | Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь<br>Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт<br>Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны<br>Гомельскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт імя П.А. Сухога<br>Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна<br>Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання<br>Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна<br>Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны<br>Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы<br>Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія<br>Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносінаў<br>Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут<br>Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва<br>БІП — Інстытут правазнаўства<br>Мінскі інстытут кіравання |
| Журналістыка,<br>Міжнародная журналістыка: | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт<br>Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка<br>Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова<br>Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы<br>прыватная ўстанова адукацыі «Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва» |
| Міжнародныя адносіны,<br>Міжнароднае права: | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт<br>прыватная ўстанова адукацыі «Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут»<br>Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносінаў<br>прыватная ўстанова адукацыі «БІП — Інстытут правазнаўства» |
| Правазнаўства,<br>Эканамічнае права: | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт<br>Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт<br>Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны<br>Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт<br>Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова<br>Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна<br>Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава<br>Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт |
| Мытная справа: | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт<br>Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт<br>Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту |

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ НАЛИБОКСКОГО СЕЛЬИСПОЛКОМА**

**проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Столбцовском районе:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по документации (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Рудня Пильнянская, 625483407101000045 | 0,0734 га | В непосредственной близости сети электроснабжения | 15 400 | 1 424 717 | 1 500 |
| 2 | хутор Усса, 625483408601000023 | 0,2436 га | | 35 200 | 2 043 761 | 3 500 |

**Примечание:** земельные участки расположены в водоохранной зоне реки Уса.

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **07.04.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.04.2009 г.** до 17.00 по вышеуказанному адресу.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

### Радавыя Перамогі

# ЖУРНАЛІСЦКАЯ «ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА» АРКАДЗЯ ТОЎСЦІКА

**У нядзелю пайшоў з жыцця Аркадзь Апанасавіч ТОЎСЦІК — старэйшына беларускай журналістыкі, галоўны рэдактар «Звязды» ў 1973—1986 гадах, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, заслужаны работнік культуры Беларусі.**



Ён заўсёды з задавальненнем гаварыў, што самыя лепшыя, самыя яркія яго ўспаміны звязаны са «Звяздой». Прынамсі, газета да апошняга дня адчувала яго мудрую падтрымку, падсілкоўвалася яго па-бацькоўску добрымі парадамі.

...Кніга ўспамінаў Аркадзя Тоўсціка «Вяртанне да вытокаў сваіх» вытрымала два выданні: у 1997 і 2000 гадах. А ля вытокаў самога аўтара была вайна, у якую ён уступіў падлеткам.

У партызанскім фармуляры, які захоўваецца ў Нацыянальным архіве сярод дакументаў былога партызанскага атрада імя Арджанікідзэ 37-й брыгады імя Пархоменкі Мінскага злучэння, запісана:

*«За час знаходжання ў атрадзе т. Тоўсцік удзельнічаў у баях і засадах па знішчэнні жывой сілы і тэхнікі праціўніка...».*

За ўдзел у партызанскім руху Аркадзь Тоўсцік узнагароджаны медалём «За адвагу».

...Аркадзь Апанасавіч прызнаваўся, што самы страшны ўспамін вайны для Яго — смерць маці ў сакавіку 1943-га. 40-гадовую жанчыну забілі карнікі з нямецкага гарнізона разам са сваімі памагатымі-паліцаямі. За сувязь з партызанамі... «Партызанскія сем'і былі ўшчэнт абрабаваныя, людзей вывелі ў бярэзнік і загадалі бегчы. А наўздагон паласнулі з кулямёта... Маці была паранена лёгка, у плячо і руку. Потым немец-педант падыходзіў да кожнай ахвяры і страляў у галаву разрыўною куляю. У маці была доўгая прыгожая каса... Калі дзядзька Хведар на санях-развалах прывёз яе цела дадому і маці клалі на покуць, акрываўленая каса матлянулася па пабеленай сцяне. І зараз у вачах маіх стаіць гэтая крывавая пляма на сцяне...».

Уся сям'я была партызанскай. Бацька — намеснік камандзіра атрада па гаспадарчай частцы, старэйшы брат Мікалай — сакратар Бабруйскага падпольнага райкама камсамола (яго рэкамендаваў К. Мазураў). Аркадзь пачынаў як сувязны...

Пісаць і публікавацца Аркадзь Тоўсцік пачаў у армейскім друку: пасля вайны больш як шэсць гадоў служыў у арміі, ішла барацьба з узброеным бандытызмам...

*«У прафесіянальную журналістыку мяне накіраваў у 1953 г. П.М. Машэраў, тады ён працаваў першым сакратаром ЦК камсамола Беларусі, — расказваў Аркадзь Апанасавіч. — А было так. Газета «Чырвоная змена» ў той час якраз пераходзіла на вялікі фармат, журналісцкіх кадраў не хапала. Таму рэдактар «Чырвонкі», пісьменнік Алесь Асіпенка, папрасіў Пятра Міронавіча накіраваць мяне ў рэдакцыю: ведаў, што я ўмею пісаць. Асіпенка быў рэдактарам ад Бога. Імпульсіўны, добразычлівы, смелы ў сваіх рашэннях, але і патрабавальны. Многае апраўдвалася тым, што пры станаўленні газеты новага фармату рэдакцыйны партфель часам і пуставаў. Нярэдка бывала: вяртаешся з камандзіроўкі — і матэрыял пішаш літаральна «з колаў». «Чырвонка» была надзвычай баявой газетай, карысталася вялікай папулярнасцю... Калі рэдактарам стаў Мікалай Еўкавіч Дастанка, ад якога так і патыхала партызанскай вольніцай, газета давала сапраўдны бой недахопам».*

Трынаццаць гадоў не адпрацаваў, а літаральна пражыў Тоўсцік у «Звяздзе». І ўвесь час настойліва шукаў журналісцкую «папараць-кветку»... А колькі журналістаў, выпеставаных у «звяздоўскай калысцы», разляцелася па іншых выданнях!.. Ён неаднойчы быў старшынёй Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі на факультэце журналістыкі БДУ, «выхопліваў» адтуль выпускнікоў, у якіх заўважаліся іскрынкі таленту...

*«Аб'ектыўнасць і адказнасць патрабуюць ад журналіста мужнасці, непадкупнасці, непахіснасці перад рознымі абставінамі, чыстага сумлення і нават нечага ў характары ад Дон Кіхота. Каб змагацца не толькі з ветракамі, але і з няпраўдай, крыўдай, за чалавека, за яго гонар. Мо тады б з цягам часу знікла з ужытку, адышло ў нябыт шыракавядомае азначэнне нашай прафесіі як другой старажытнай»,* — меркаваў Аркадзь Тоўсцік.

Катэгарычна не прымаў ветэран «пераасэнсаванняў» падзей Вялікай Айчыннай вайны, калі асноўнае — галоўнае! — наўмысна замоўчваецца, а другараднае, неістотнае, наадварот, «ускалмачваецца». Заўсёды шчыра радаваўся, калі «Звязда» аргументавана выкрывала пераліцоўшчыкаў.

*«Новыя «апосталы» стараюцца ў сваіх выказваннях прыклеіць усенароднаму руху ярлык «бандыцкая партызанка». Але ж канцы з канцамі ў іхніх паклёпніцкіх развагах не сходзяцца. Усе сяляне, як кажуць яны, ваявалі з акупантамі, і раптам яны ўсе бандыты?.. Творчасць навааўленых літпаклёпнікаў ніяк не запляміць гонару Беларусі-партызанкі і слаўных імёнаў соцень тысяч жывых і мёртвых народных мсціўцаў. Яны сваю гістарычную справу здзейснілі».*

...Аднойчы Аркадзь Тоўсцік расказаў Івану Шамякіну, як сяляне самасудам пакаралі паліцая — вяскоўца, які вярнуўся з «адсідкі»: не даравалі яму нават праз гады кроў людскую... Паводле гэтай гісторыі народны пісьменнік Беларусі стварыў адзін з самых лепшых сваіх раманаў — «Вазьму твой боль».

Як шкода, што адыходзяць магікане з Пакалення Пераможцаў...

СМУТКУЕМ.

**Таццяна ПАДАЛЯК і ўсе звяздоўцы.**

**Міністэрства інфармацыі смуткуе ў сувязі са смерцю былога галоўнага рэдактара газеты «Звязда», старшыні Саюза журналістаў Беларусі ТОЎСЦІКА Аркадзя Апанасавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты, члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі глыбока смуткуюць з выпадку смерці былога галоўнага рэдактара газеты «Звязда» ТОЎСЦІКА Аркадзя Апанасавіча і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.**

### Бернд ШТАНГЕ:

# «ЗАБРАЦЬ АЧКІ Ў КАЗАХСТАНА І МАЛДОВЫ І РАЗДАЛБАЦЬ ХАРВАТЫЮ»

**Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па футболе Бернд Штанге сустрэўся са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Нямецкі спецыяліст не стамляецца несці футбол у масы і падкрэслівае, што за апошні год гульнёй нумар адзін пачала цікавіцца вялікая колькасць людзей. «Калі прадаўшчыца на Камароўскім рынку пытае: «Чаму вы прайгралі Англіі?», для мяне гэта станоўчы момант». Сустрэча са студэнтамі, напэўна, дадала трэнеру добрых эмоцый, бо пытанняў было шмат — ад «Чаму прайгралі Люксембургу?» (на што трэнер з усмешкай заўважыў, што лепш яго не злаваць такім пытаннем) да аспектаў яго працы ў Іраку і стаўлення да Садама Хусейна.**

**Трэба заўважыць, што да сустрэчы нямецкі спецыяліст падышоў творча: падрыхтаваў для студэнтаў відэафільм аб сваёй працы з нацыянальнай зборнай Ірака (якая супала з перыядам ваенных дзеянняў), сабраў шэраг фотаздымкаў самай адметнай на падзеі беларускай футбольнай восені-2008, калі ў Мінску згулялі зборная Англіі, мадрыдскі «Рэал», турынскі «Ювентус» і піцерскі «Зеніт» пры аншлагу на стадыёне «Дынама», а таксама зазірнуў у будучыню беларускага футбола, паказаўшы юнацкую, юніёрскія зборныя, і зусім юных футбалістаў, якія робяць у спорце свае першыя крокі. Пасля паказу фільма пра Ірак, са зборнай якой нямецкі трэнер прайшоў алімпійскую кваліфікацыю і заняў чацвёртае месца на Алімпіядзе ў Афінах, Бернд Штанге рэзюмаваў: «Вось што жаданне робіць з людзьмі ў складаных умовах. Хто гэта перажыў, не будзе больш скардзіцца на дрэнную гасцініцу ці ежу. У такіх умовах таксама можна дасягнуць поспеху». Прывядзём найбольш цікавыя пытанні студэнтаў БДУ і адказы на іх галоўнага трэнера.**

**—Як іракскія футбалісты і іракцы ставіліся да амерыканцаў і Садама Хусейна?**

— Прывяду адзін прыклад. Васьмігадовай дачцэ другога трэнера іракскай зборнай асколкам выбіла вока. Гэты трэнер паўтараў: «Буш, што мы табе зрабілі — я і мая дачка?» Гульцы прыходзілі на абед і прыносілі спісы: забіта 16 амерыканскіх салдатаў. Большасць людзей была настроена супраць амерыканцаў. Баяліся і Садама, але амерыканцаў усё ж больш... Мы са зборнай неяк гулялі ў Англіі. У гэты час англічане стралялі ў Басры і забівалі людзей. Пасля нас з гульцамі прымаў міністр замежных спраў Вялікабрытаніі. Гульцы з Басры не пайшлі з ім фатаграфавацца. Я сфатаграфаваўся, пасля мы з міністрам паціснулі адзін аднаму рукі. А потым я яшчэ доўга атрымліваў лісты з пагрозамі. На маёй радзіме мне нават сказалі: гэта робіцца занадта небяспечным, час пакідаць Ірак... Вайна была ў 2003-м, але дагэтуль там няма дэмакратыі.

**— Ваш эталон трэнера ў свеце?**

— У свеце шмат добрых трэнераў — сотні. Але няшмат трэнераў, якія на найвышэйшым узроўні вытрымліваюць увесь гэты націск. Іх 10-15. Свен Горан Эрыксан, Арсен Венгер, сэр Алекс Фергюсан, Жазэ Мурынью — вось абсалютныя аўтарытэты сярод трэнераў. Яны шмат дзесяцігоддзяў працуюць у вялікіх клубах і нават пад вялікім націскам захоўваюць нервовы спакой. Гэта вельмі няпроста працаваць з камандай, дзе ўсе футбалісты — мільянеры, з прэсай, балельшчыкамі. А самы лепшы трэнер — заўсёды чэмпіён свету.

**— Якія якасці вы цэніце ў беларусах больш за ўсё?**

— Я ахвотна жыву ў вашай краіне. Беларусы — чыстая і адкрытая нацыя. У вашай краіне вельмі годныя людзі, і гэту годнасць нельга парушаць. Калі мы прайгралі Люксембургу, мы нанеслі ўрон вашай годнасці. Шкада, што ў Беларусі няма золата, срэбра, нафты... Але гэта вельмі прыгожая краіна. Калі ацэньваць футбольныя якасці, то ў вас вельмі шмат хуткасных гульцоў. У немцаў іх не так многа. Вельмі старанныя футбалісты. Праблема ў тым, як яны паводзяць сябе ў жыцці, у тым, што ўжываюць алкаголь. Я ляцеў неяк з адной нашай футбольнай камандай. Калі ў д'юці-фры я зазірнуў у кошык аднаго гульца, там былі толькі бутэлькі са спіртным. Я спытаў: «Ты для сябе? — «Так, для сябе і для мамы». Нельга сумяшчаць алкаголь і прафесійны спорт.

**— Якія словы перад матчам гаворыце хлопцам?**

— У нас ёсць пэўныя рытуалы, цырымоніі. Мы рыхтуем каманду, кожны гулец атрымлівае сваё заданне, паказваем на відэа, якім павінна быць аблічча каманды: забяганні, прэсінг, адборы. Потым размінка. Пасля заходзім у раздзявальню, футбалісты скідваюць абутак — хтосьці з правай пачынае, хтосьці з левай, пераапранаюцца. Слухаюць стадыён, гледачоў. Потым садзімся і адну хвіліну моўчкі канцэнтруемся. Кожны ўяўляе, як выйграе сваё адзінаборства. Потым я гучна пляскаю ў далоні і ўсе выходзяць з намерам перамагчы, з устаноўкай гуляць першыя 5 хвілін так, быццам бы гэта апошнія 5 хвілін у жыцці. На апошняй гульні на Кіпры ніхто не канцэнтраваўся. Гульцы меркавалі, што гэта лёгкая гульня — і вось ён пройгрыш. Пасля гульні я нічога не кажу гульцам. Ёсць назіранне, што калі ў футбаліста мокрыя валасы, не трэба нічога казаць.



Фота БЕЛТА.

Хоць бывае і інакш. Гульня нашай зборнай ва Украіне. Тры хвіліны дадатковага часу. Чацвёрты суддзя кажа мне: трэнер, засталося 20 секундаў. Я рады, што нічыя, і ачко ў нас у кішэні. Ідзе адваротны адлік: 10, 9, 8. Чухлей у штрафной падае на руку, пад яе падкатваецца мяч, нам назначаюць 11-метровы — мы прайграём 0:1. У раздзявальні Чухлей плача пад душам, і я разумею, што трэба штосьці рабіць, трэба яму дапамагчы. Гэта тая гісторыя, якую ён будзе памятаць усё жыццё...

Бываюць і камічныя выпадкі. Адзін мой калега да таго захапіўся на ўстаноўцы, што сам не заўважыў, як назваў 12 гульцоў замест 11. Футбаліст яму кажа: трэнер, ты памыліўся. «І сапраўды, тады ты лішні». Шмат цікавага здараецца ў раздзявальнях. Фергюсан кінуў бутсу ў Дэвіда Бекхэма, з-за чаго той вымушаны быў змяніць клуб, Матэус ударыў гульца пасля пройгрышу, Рамашчанка пакрыўдзіўся на мяне за тое, што я замяніў яго і паехаў дадому...

**— Вячаслаў Глеб падпісаў кантракт з кітайскім клубам. Ваша стаўленне да гэтага?**

— У мяне добрыя адносіны з гульцамі. Вячаслаў запрасіў мяне ва ўкраінскі рэстаран «Падвор'е». Растлумачыў, што ёсць шанц гуляць у Кітаі. Спытаў, што я параю — гэта нармальны, прыстойны шлях. Ён атрымаў фантастычны кантакт. Я паглядзеў на гэту каманду на зборы ў Турцыі. Але я не змагу далей яго кантраляваць у Кітаі.

**— Аляксандр Глеб не гуляе ў «Барселоне», і нават не заўсёды трапляе ў заяўку. Наколькі мэтазгодным быў яго пераход з «Арсенала»?**

— Гэта было яго рашэнне, і тут складана сказаць, добра гэта ці дрэнна. Я раіў застацца ў «Арсенале». У Лондане Саша быў героем. На вуліцы, дзе б мы з ім ні шлі, тут жа нас акружалі чалавек 20, прасілі аўтографы. «Барселона» — выдатны клуб. Але Глеб не гуляе, СМІ спекулююць гэтым, ён нервуецца. Я сказаў яму: трэба прабівацца, змагацца, і магчыма, у цябе атрымаецца. А клуб змяніць паспееш заўсёды. У «Барселоне» сабрана 25 гульцоў сусветнага ўзроўню. Сем сядзяць на лаўцы запасных, яшчэ сем — на трыбуне. Трэба прабівацца. Я таксама нервуюся — гэта наш капітан і ён не гуляе.

**— Вы шмат зрабілі за час працы ў Беларусі. Але каб узняць наш футбол на больш высокі ўзровень, трэба нямала часу. Ваш кантракт да 2010 года. Наколькі верагодна, што вы застанецеся працаваць у Беларусі?**

— Мая асабістая мэта — любымі сродкамі прабіцца ў кваліфікацыю. Англію ніхто не дагоніць. Мы будзем змагацца за другое месца. Калі мне не ўдасца зрабіць кваліфікацыю, возьмуць іншага. І я буду вельмі расчараваны, калі не дасягну сваёй мэты. Каб перамагчы Харватыю, каманду сусветнага ўзроўню, кожны павінен выкладвацца на 100 працэнтаў. На Кіпры ніхто не аддаваўся на ўсе 100. «Дарыда» зачыняе стадыён перад гульнёй, п'яны суддзя выходзіць судзіць, гулец пасля Калядных канікулаў набірае 9 кілаграмаў лішняй вагі. Так мы нічога не дасягнем. У нас вельмі моцная група — я на 10 сантыметраў зменшыўся ў росце, калі даведаўся вынікі жараб'ёўкі. Федэрацыя кажа, што наша мэта — трэцяе месца. І за яго мы атрымаем прэмію. Каб стаць трэцімі, нам трэба выціснуць кагосьці з моцных. Але трэцяе не лічыцца, каб ісці далей, трэба быць другімі. Наша задача — забраць ачкі ў Казахстана і Малдовы і разграміць Харватыю ў Мінску.

**Напрыканцы сустрэчы Бернд Штанге даў студэнтам параду: «Талент нічога не значыць без цяжкай працы. Калі не працаваць — нічога не дасягнеш. Так у футболе, так і ў жыцці».**

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Royal

**ОТЧЕТ О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ**

**«Королевские подарки»**

В период с 01 февраля 2009 года по 26 февраля 2009 года (включительно) в казино «Royal» проводилась рекламная игра «Королевские подарки». В игре участвовало 25 человек. В момент проведения рекламной игры изменения в правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению не вносились.

В результате проведения розыгрыша призовой фонд в размере 53 400 000 (пятьдесят три миллиона четыреста тысяч) белорусских рублей был разыгран в полном объеме.

Победители рекламной игры:

В **1-ом этапе** розыгрыша, который проводился 12 февраля 2009 года, денежный приз в размере 26 700 000 (двадцать шесть миллионов семьсот тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 1 этапа рекламной игры, получил **Крискевич Николай Федорович.**

Во **2-ом этапе** розыгрыша, который проводился 26 февраля 2009 года, денежный приз в размере 26 700 000 (двадцать шесть миллионов семьсот тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 2 этапа рекламной игры, получил **Коташенко Сергей Иванович.**

В период проведения рекламной игры стоимость условной единицы не менялась.

Организатором рекламной игры «Королевские подарки» являлось ООО «Дакарай». Правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению, размер и состав призового фонда были зарегистрированы Министерством торговли Республики Беларусь.

*Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры № 1301 от 23 января 2009 года.* УНП 190617507

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (28 лютага). Па гарызанталі:** Авангард. Згода. Ружа. Блінчык. Рубка. Ананд. Рака. Казадой. Аполак. Каса. Гарляк. Выбары. Кадр. Дон. Агурок. Салата. Лава. Дэлі. «Ася». Натура. Сінод. Ралі. Слон. Атава. Стапа. Алегорыя. **Па вертыкалі:** Падлетак. Гута. Асілак. Базар. Кулан. Луара. Індыя. Довад. Каркас. Чай. Лата. Гагарын. Рота. Указ. Анапа. Род. Вал. Абардаж. Сініца. Шыла. Аброк. Лат. Каларада. Бакас. Ротар. Акарына. Акацыя.

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**ПЕРАДАПОШНЯЕ ЗАДАННЕ**

Працягваем аўтарскі конкурс-6 майстра кампазіцыі Беларусі і ФМЖД Віктара Шульгі (Мінск) перадапошнім заданнем № 14:



БЕЛЫЯ: a1, a7, c1, c7, d6, e1, g3 (7). ЧОРНЫЯ: b4, b8, c3, f2, g5, g7, h4 (7). Выйгрыш.

Па-за конкурсам развяжыце і такую задумку В. Шульгі:

БЕЛЫЯ: a5, b4, c5, d4, d6, e5, g1 (7). ЧОРНЫЯ: a3, a7, f4, g3, g5, g7, h8 (7). Перавага белых.

* * *

А ў рамках бліца-43/6, пераможца якога таксама будзе адзначаны, развяжыце задачу Аляксандра Шурпіна (Клімавічы), якая ў Адэскім міжнародным конкурсе 1992 года атрымала 7,5 ачка па змесце і яшчэ не друкавалася:



БЕЛЫЯ: 11, 15, 22, 24, 27, 30, 38, 43, дамкі 6, 7, 46, 49 (12). ЧОРНЫЯ: 21, 25, 32, дамкі 14, 16, 37 (6).

Замкнуць простую чорных: 39 (43А) 10, 34, 26, 32, 32#. Варыянт жа А(34) застаецца за вамі.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

**ЧЭМПІЯНАТ ВОБЛАСЦІ**

Ён праходзіў па кампазіцыі ў рускія шашкі пад эгідай Мінскага аблвыканкама, быў шостым па ліку і адкрытым для ўсіх складальнікаў свету. У ім перамаглі: у жанры мініяцюр — майстры Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў), Аляксандр Кагоцька (Пінск) і Іван Наўроцкі (Мінск), праблем — мінчане Васіль Грабенка, майстар Мікалай Грушэўскі і расіянін Рыгор Шасцірыкаў, у раздзеле эцюдаў — гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель), А. Лук'янаў (Расія) і В. Грабенка, задач — Л. Вітошкін, І. і Б. Вальтэры (Узбекістан) і Ф. Ганіеў (Украіна).

Наступныя камбінацыі суддзі Аляксандр Ляхоўскі (Беларусь) і Іван Івацка (Украіна) прызналі выдатнымі:

№ 1 (В. Грабенка). БЕЛЫЯ: b4, b6, c5, c7, d6, e7, g3, g5, g7 (9). ЧОРНЫЯ: a5, b2, c3, d2, e3, e5, f4, f8, h2, h6 (10). 8,5 ачка: b8 (ec7) d6!, h8 (a5A) g1, c5, f2 (g5) b6, h4x. A(d6) g1, a3 (b4) c5, f2 (g5) b6, h4x.

№ 2 (М. Грушэўскі, П. Шклудаў). БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, e5, e7, f6, g5, h6 (8). ЧОРНЫЯ: a5, c3, d4, e3, f2, f4, g3, h2, h4 (9). 8,25 ачка: cd8, b8, f4!, a5, a:d2:e7, g1#.

Арганізатар чэмпіянатаў Мінскай вобласці А. Ляхоўскі запрашае ўсіх жадаючых складальнікаў, уключаючы і замежных, узяць удзел у сёмым першынстве ў тых жа самых раздзелах. У кожны з іх можна прадставіць па чатыры новыя кампазіцыі. Яны павінны адпавядаць патрабаванням Шашачнага кодэксу Беларусі ці былога СССР. Тэрмін іх прысылкі — да 15.04.2009 г. на адрас рэдакцыі газеты «Мінская праўда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**ПЕРШЫНСТВЫ СВЕТУ І БЕЛАРУСІ**

Падведзены вынікі першынства свету па завочных рускіх шашках — WCK-01. Першыя тры прызавыя месцы заваявалі каманды Літвы, Беларусі і Украіны. Нашу рэспубліку прадстаўлялі майстры гульні па перапісцы А. Ляхоўскі, В. Марцінкевіч, В. Навумік, А. Осіпаў і В. Сакаў. Ва асабістым заліку мацнейшым быў міжнародны гросмайстар Сяргей Краўчук (Украіна). Пятае-шостае месцы падзялілі А. Осіпаў і А. Ляхоўскі, адстаўшы ад пераможцы на 1 ачко.

А ў Мінску ў першай лізе чэмпіянату Беларусі па міжнародных шашках вызначыўся майстар ФМЖД Віталь Варушыла (Мінск). Яшчэ чатыры пуцёўкі ў вышэйшую лігу дасталіся сталічнаму міжнароднаму гросмайстру Ірыне Пашкевіч, майстру ФМЖД Мікалаю Кадзеснікаву (Бабруйск), кандыдату ў майстры спорту А. Куніцы і майстру ФМЖД Наталлі Герасімовіч. А ў галоўны жаночы турнір года перайшлі майстар Кацярына Шпакава (Мінск) і кандыдат у майстры Святлана Ланцэева (Жодзіна).

*Дарагую цётачку і сястру **Ніну Сяргееўну Хроль** віншуем з 80-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, бадзёрага настрою і доўгіх гадоў жыцця. Мы вас любім.*

***Пляменнікі і сёстры,** г. Слуцк.*

Частное торговое предприятие «Сударыня», зарегистрированное Минским облисполкомом за № 690622404, выданным 07.02.2008 г., сообщает о ликвидации. Претензии принимаются в течение двух месяцев по тел. 345-57-83.

**У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлым **Прымачука Аляксея Афанасьевіча,** 27 жніўня 1928 года нараджэння, ураджэнца с. Стараселле Маневічскага раёна Валынскай вобласці, Украіна, які пражываў у г. Рэчыца па вул. Дастаеўскага, 27-24 Гомельскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Прымачука А.А., паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл. (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, 30) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА САКАВІК

Працягваем публікаваць гараскоп прычосак на наступны месяц. Да вашай увагі — гараскоп стрыжак на сакавік.

**3 сакавіка.** Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не



толькі знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмацніцца праніклівасць розуму.

**4 сакавіка.** У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягніце да сябе ўдачу і шчасце.

**5 сакавіка.** Вельмі дрэнны дзень для стрыжкі валасоў: могуць узнікнуць розныя захворванні. Калі хочаце пазбегнуць праблемаў са здароўем — устрымайцеся сёння ад наведвання цырульні.

**6 сакавіка.** У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягніце ў сваё жыццё радасць і ўдачу.

**7 сакавіка.** Сёння надзвычай неспрыяльны дзень для наведвання цырульніка. Стрыжка валасоў можа прыцягнуць да чалавека мноства праблемаў, хваробаў і непрыемнасцяў.

**8 сакавіка.** У гэты дзень наведванне цырульні станоўча адаб'ецца не толькі на вашай знешнасці, але і на фінансавым становішчы. Сённяшняя стрыжка валасоў прыцягне ў ваша жыццё багацце і дабрабыт.

**9 сакавіка.** Сёння выдатны дзень для наведвання цырульніка. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, зменіць у лепшы бок усё ваша жыццё. У найбліжэйшыя месяцы пачнуць адбывацца станоўчыя змены ў асабістым жыцці, кар'еры і стане здароўя.

**10 сакавіка.** Сёння лепш устрымацца ад стрыжкі, інакш могуць з'явіцца праблемы ў розных галінах жыцця. Негатыўныя звычкі праявяцца ў поўнай меры, узрасце цяга да алкаголю, а магчымасць кантраляваць свае эмоцыі, наадварот, зменшыцца.

**11 сакавіка.** Пажадана стрыгчыся, паколькі стрыжка прынясе шчасце і карысць, прыгожы знешні выгляд.

**12 сакавіка.** Стрыжка валасоў у гэты дзень можа значна пагоршыць стан вашага здароўя. Сёння лепш пазбягаць зменаў знешняга выгляду.

**13 сакавіка.** Згодна з усходнімі павер'ямі, стрыжка ў гэты дзень прыцягне да вас злых духаў, што ў сваю чаргу, адаб'ецца на стане здароўя і дабрабыце. Таму змены свайго знешняга выгляду лепш адкласці на іншы дзень.

**14 сакавіка.** У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягніце ў сваё жыццё ўдачу і радасць.

**15 сакавіка.** Сёння не самы лепшы дзень для наведвання цырульніка: могуць узнікнуць розныя захворванні ці з'явяцца цяжкасці ў розных галінах жыцця.

**16 сакавіка.** У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягніце ў сваё жыццё ўдачу і радасць.

**17 сакавіка.** Стрыгчы валасы сёння непажадана: можна «адрэзаць» сваю ўдачу.

**18 сакавіка.** У гэты дзень спробы стварыць прычоску, якая ўпрыгожвае менавіта вас, будуць паспяховымі.

**19 сакавіка.** Калі пастрыгчыся ў гэты дзень, то валасы будуць лепш расці, стануць больш густымі і пышнымі. Але сёння непажаданае хімічнае ўздзеянне на валасы (фарбаванне, завіўка). А складаная ўкладка пратрымаецца нядоўга.

**20 сакавіка.** Пасля стрыжкі, зробленай у гэты дзень, валасы стануць таннейшымі. Затое будуць марудна адрастаць, і форма, створаная цырульнікам, захаваецца надоўга. Магчыма, зменіцца і колер валасоў: яны стануць цямнейшымі.

**21 сакавіка.** Пасля зробленай сёння стрыжкі валасы будуць гусцейшымі. Наведванне цырульні не толькі палепшыць ваш знешні выгляд, але і адновіць душэўную раўнавагу.

**22 сакавіка.** Зробленая сёння стрыжка ўзбагаціць вас не толькі эстэтычна, але і практычна: вы станеце крыху багацейшымі.

**23 сакавіка.** Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, пойдзе на карысць не толькі знешнасці, але і духоўнаму свету. У вас абвострыцца інтуіцыя і ўзмоцніцца пранікліваcць розуму.

**24 сакавіка.** Сёння лепш устрымацца ад стрыжкі, інакш могуць з'явіцца праблемы ў розных галінах жыцця. Негатыўныя звычкі праявяцца ў поўнай меры, узрасце цяга да алкаголю, а магчымасць кантраляваць свае эмоцыі, наадварот, зменшыцца.

**25 сакавіка.** Выдатны дзень для наведвання цырульні: зробленая сёння стрыжка забяспечыць здароўе і даўгалецце.

**26 сакавіка.** У гэты дзень стрыжка валасоў можа павялічыць вочны ціск, што прывядзе да пагаршэння зроку,



запалення ці абвастрэння хваробаў вачэй. Лепш пачакаць з наведваннем цырульні.

**27 сакавіка.** Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, не застанецца незаўважанай. Вашым новым абліччам будуць зачараваныя ўсе навакольныя.

**28 сакавіка.** Сённяшняя стрыжка зробіць вас не толькі больш прывабнымі, але і прыцягне ўдачу.

**29 сакавіка.** У гэты дзень наведванне цырульні станоўча адаб'ецца не толькі на вашай знешнасці, але і на фінансавым становішчы. Сённяшняя стрыжка прыцягне ў ваша жыццё багацце і дастатак.

**30 сакавіка.** У гэты дзень лепш устрымацца ад стрыжкі, паколькі гэта можа прывесці да недамагання: павышэння ціску, галаўных боляў, з'яўлення пачуцця страху.

**31 сакавіка.** Стрыжка валасоў у гэты дзень можа значна пагоршыць ваш стан здароўя. Лепш сёння пазбягаць змянення знешняга выгляду.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# ДЗІЦЯЧАЯ ПРАГРАМА «НАША ПЯЦЁРАЧКА» ПАДРАСЦЕ

**Пачынаючы з сакавіка, павялічыцца ўзрост удзельнікаў хіт-параду праграмы — прадстаўляць свае кліпы і спаборнічаць за галоўны прыз, прафесійныя здымкі новага кліпа, змогуць юныя артысты ва ўзросце ад 10 да 15 гадоў. (Раней узрост удзельнікаў абмяжоўваўся 6—13 гадамі).**

«Праграма ў эфіры існуе тры гады, натуральна, што і ўдзельнікі хіт-параду, і яго вядучыя падраслі. Гэтаксама падрасла і аўдыторыя праграмы, — тлумачыць перамены загадчык аддзела падрыхтоўкі праграм для дзяцей і юнацтва Белтэлерадыёкампаніі Алена Будрыцова. — Таму мы вырашылі абнавіць змест і афармленне «Нашай пяцёрачкі». Абноўлены праект стане, па задуме яго стваральнікаў, больш дынамічным — за паўгадзіны максімальную колькасць навінаў пастараюцца даць вядучыя і журналісты. Знаёміць з імі паранейшаму будзе ўладальнік другога месца на дзіцячым «Еўрабачанні-2006» Андрэй Кунец, а вядучай усёй праграмы застанецца пераможца дзіцячага «Еўрабачання-2005» Ксенія Сітнік. А вось цацачных герояў праграмы — двух забаўных пушыстых катоў, якія каментавалі размовы вядучых і гасцей — на жаль, вырашана пакуль што адправіць у водпуск.

Першы выпуск абноўленай «Нашай пяцёрачкі», паведамілі ў прэс-службе БТРК, выйшаў у эфір ужо 1 сакавіка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тэлесеткі

# Зоркі вучацца танцаваць, каб... паехаць на "Еўрабачанне"

У гэтым верасні ў трэці раз пройдзе міжнародны конкурс «Танцавальнае Еўрабачанне». Першыя два спаборніцтвы наша краіна толькі транслявала (і небеспаспяхова), а вось цяпер вырашыла далучыцца да ўдзелу.

Паводле правілаў конкурсу — яго, як і песеннае «Еўрабачанне», ладзіць Еўрапейскі Вяшчальны саюз — удзел у ім бяруць танцавальныя пары, дзе толькі адзін партнёр — прафесійны танцор, а другі — вядомы ў сваёй краіне чалавек, але ў якой-небудзь іншай галіне. Напрыклад, ад Расіі на конкурсе летась выступалі ўдзельнікі тэлепраекта «Танцы з зоркамі», пара Таццяна Наўка—Аляксандр Літвіненка. Адбор прадстаўнікоў Беларусі сёлета пройдзе таксама ў фармаце тэлевізійнага конкурсу — Белтэлерадыёкампанія прыступіла да рэалізацыі праекта «Зорныя танцы».

Як паведаміла прэс-служба БТРК, нацыянальны адборачны тур — праект «Зорныя танцы» — складаецца з некалькіх этапаў. У першым туры 36 вядомых асобаў пад кіраўніцтвам прафесіяналаў асвойваюць танга, ча-ча-ча і вальс. Рэпетыцыі, дарэчы, ужо ідуць — тройчы на тыдзень у сталічным Палацы дзяцей і моладзі спевакі Аляксей Хлястоў, Герман, Іскуі Абалян, Венера, Вікторыя Алешка, Алена Грышанава, Дзядзя Ваня, спартсменкі Іна Жукава і Юлія Раскіна, акцёры Алег Коц, Руслан Чарнецкі, Валерыя Арланава, тэлевядучыя Аліна Краўцова, Ганна Эйсмант, Дзмітрый Карась, Вольга Барабаншчыкава, Алег Ціткоў і іншыя займаюцца з харэографамі. Сюжэты з урокаў танцаў можна ўбачыць у праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» на Першым канале. Часу ў «зорак» зусім нямнога — 16 сакавіка журы адбярэ 8 удзельнікаў, якія пройдуць у наступны тур. Для іх з ліку прафесійных танцораў Беларуская федэрацыя танцавальнага спорту падбярэ партнёраў. Пачынаючы з красавіка кожны тыдзень па суботах 8 пар будуць паказваць журы і тэлегледачам танцавальныя нумары і атрымліваць за іх адзнакі. Дзве пары, якія набяруць найменшую колькасць балаў, стануць намінантамі на выбыванне з праекта, але адну з іх гледачы змогуць «выратаваць» СМС-галасаваннем.

У фінале з трох пар тэлегледачам трэба будзе выбраць адну. Пераможцы, якія набяруць больш за ўсё галасоў, і будуць прадстаўнікамі Беларусі на конкурсе «Танцавальнае Еўрабачанне» (Eurovision Dance Contest), які пройдзе ў Баку (Азребайджан).

Вядучымі шоу «Зорныя танцы» стануць фітнэс-інструктар Святлана Кашыцкая і акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Віталь Макарэвіч, мастацкае кіраўніцтва праектам здзяйсняе старшыня Беларускай федэрацыі танцавальнага спорту, дырэктар Белдзяржцырка Таццяна Бандарчук.

А далей?

«Танцавальнае Еўрабачанне» сёлета адбудзецца ў Баку на арэне спартыўна-канцэртнага комплексу імя Гейдара Аліева. Як чакаецца, у конкурсе могуць узяць удзел да 20 краін (летась іх было 14, а транслявалі конкурс 24 краіны). У шоу, разлічаным больш як на 2 гадзіны, пары павінны будуць прадэманстраваць танец у свабоднай харэаграфіі з выкарыстаннем нацыянальных матываў краіны, ад якой яны выступаюць. Пераможцамі становіцца пара, якая набярэ найбольшую колькасць балаў ад тэлегледачоў і журы, складзенага з прафесійных танцораў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.53 | 17.51 | 10.58 |
| Віцебск — | 6.44 | 17.39 | 10.55 |
| Магілёў — | 6.43 | 17.41 | 10.58 |
| Гомель — | 6.38 | 17.39 | 11.01 |
| Брэст — | 7.08 | 18.06 | 10.58 |
| Гродна — | 7.07 | 18.08 | 11.01 |

**Месяц**

***Першая квадра. Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Марыяны, Міны, Фёдара.* ***К.*** *Алены, Віктара, Паўла, Радаслава.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




## Дзве даты

## 3 сакавіка

**1067 год** — адбылася бітва на рацэ Няміга (прыток Свіслачы ў межах сучаснага Мінска) паміж дружынамі кіеўскіх князёў Яраслвічаў і полацкага князя Усяслава, вядомага па прозвішчы Чарадзей. Закончылася бітва паражэннем палачан. Мінск (Менеск) быў разрабаваны, спалены, жыхары, якія засталіся жывымі, захоплены ў палон. Пра гэту крывавую бітву расказвае «Слова аб палку Ігаравым»: «На Немизе снопы стелют головами... живот кладут, веют душу от тела. Немизе кровави брезе ... посеяни костьми русских сынов». Яна адлюстравана на мініяцюры Радзівілаўскага летапісу XIII ст. Гэтая дата стала пунктам адліку летапіснай гісторыі беларускай сталіцы.



**1918 год** — у Брэст-Літоўску быў падпісаны мірны дагавор (Брэсцкі мір) паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блока (Германія, Аўстра-Венгрыя, Балгарыя, Турцыя), які забяспечыў Расіі выхад з сусветнай вайны і мірную перадышку. Мірны дагавор быў ануляваны 13 лістапада таго ж года пастановай ВЦВК і СНК, а канчаткова ліквідаваны ў адпаведнасці з Версальскімі дамоўленасцямі 1919 года.

## Цытата дня:

***«Лягчэй сустрэць людзей, якія маюць розум, чым тых, хто ўмее накіроўваць яго ў справу, шануе розум у іншых і знаходзіць яму карыснае выкарыстанне».***

**Жан Лабруер (1645—1669), французскі пісьменнік.**

# ЛАПЦІ

Свет і сусвет чалавека

**Лапці доўгі час служылі сялянам асноўным відам абутку. Іх плялі з пянькі, ільну, ліпавага ці бярозавага лыка, берасты, пазней — са скуры хатняй жывёлы. Лапці мелі не толькі практычнае ўжыванне. Вельмі часта яны станавіліся атрыбутам пэўных абрадаў, прычым магічнымі якасцямі валодалі старыя, ужо зношаныя лапці.**

- У якасці абярэгаў ад нячыстай сілы і «ліхога» вока лапці вывешвалі на хлявах, агароджах, тынах, каля агародаў, на варотах. Часам іх колькасць дасягала ста пар. Меркавалі: чалавек падыдзе да плота, убачыць столькі лапцей, здзівіцца і не сурочыць мой двор, маю гаспадарку.
- Прысутнасць лапцей у курніку павінна была павялічыць колькасць знесеных яек, засцерагчы курэй ад сурокаў і хваробаў.
- Старым лапцем абкурвалі карову пасля ацёлу.
- Падчас эпідэміі менавіта лапці прапітвалі дзёгцем і развешвалі ў хатах, хлявах, курніках.
- Стары лапаць дапамагаў і пры ўлазінах — ім «задобрывалі», «заваблівалі» дамавіка ў новую хату.
- У час пахавання лапаць мог выступаць як ахвяраванне, своеасаблівы падарунак продкам.
- Лічылася, што калі вакол агарода на некалькі штыкецін надзець старыя лапці, то вусені не паядуць капусту, машка ёй не ўшкодзіць, а «галовы» вырастуць вялікія і сакавітыя.
- Каб было шмат агуркоў, лапаць неабходна закінуць на сярэдзіну градкі і сказаць: «Як гэты лапаць густа плёўся, так і агуркі мае пляціцеся і радзіцеся!».
- Каб пазбавіцца ад тараканаў, выконвалі наступнае рытуальнае дзеянне: у лапаць саджалі столькі тараканаў, колькі было членаў сям'і, і «вывозілі» лапаць з тараканамі праз парог, у двор.
- Катэгарычна забаранялася плесці лапці на працягу Калядаў, інакш у сям'і народзіцца «крывое» дзіця.
- А яшчэ прыкмячалі: калі лапці рвуцца спераду — бяда наперадзе, калі яны знасіліся, стапталіся ззаду, на пятах — бяда прайшла.
- Казалі: калі ў лапцях часта развязваюцца аборы, ведай, што цябе нехта вельмі кахае і сумуе па табе.
- У народзе ведалі: каб дзень прайшоў паспяхова, спачатку абувалі правы лапаць, а потым левы.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

На кінафэсце пазнаёміліся два рэжысёры:

— Над чым вы зараз працуеце?

— Здымаю кіно аб каханні.

— Жанчыны да жанчыны?

— Не, зусім не.

— А, мужчыны да мужчыны?

— Не.

— Юнака да курыцы?

— Ды не!

— А аб якім жа тады каханні ваш фільм?

— Мужчыны да жанчыны.

— А-а, дык вы дакументаліст...

☺

**У гасцях:**

**— Моня! Гэта не еш, гэта ў нас дома ёсць!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1142. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12